Ірына Екадумава

# РАСІЙСКАЯ РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ

Беларуска-расійскія міжрэгіянальныя сувязі абумоўленыя перадусім эканамічнай каапэрацыяй дзьвюх краінаў. Ёй спрыяюць гаспадарчыя сувязі, што захаваліся з савецкіх часоў, дамовы на ўзроўні беларускага ўраду і адміністрацыяў рэгіёнаў, а таксама паміж асобнымі прадпрыемствамі.

## Сучасны стан рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі ў Расіі

За апошнія 6 гадоў інтэнсіўна наладжваліся сувязі паміж Беларусяй і расійскімі рэгіёнамі. У пачатку 1996 г. Беларусь мела ўстойлівыя сувязі ўсяго з шасьцю расійскімі рэгіёнамі — Масквой, Краснадарскім краем, Маскоўскай, Цюменскай, Мурманскай і Валгаградзкай абласьцямі. У тым годзе ўва ўзаемных пастаўках прадукцыі зь беларускімі прадпрыемствамі ўдзельнічалі суб'екты гаспадараньня 37 рэгіёнаў Расіі. За пэрыяд з 1995 па 2000 гг. паміж адміністрацыямі суб'ектаў РФ і тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак Беларусі было ўкладзена больш за 100 двухбаковых пагадненьняў і дамоваў.

Па выніках студзеня 2002 г. першыя месцы ў агульным тавараабарачэньні Рэспублікі Беларусі з рэгіёнамі Расіі займалі Масква, Цюменская вобласьць, Санкт-Пецярбург, Маскоўская, Смаленская і Яраслаўская вобласьці[1] (гл. табл.1).

У Беларусі дзейнічаюць прадстаўніцтвы 9 рэгіёнаў Расіі — Краснадарскага, Алтайскага, Прыморскага, Стаўрапольскага краёў, Калінінградзкай, Мурманскай і Яраслаўскай абласьцей, рэспублік Дагестану і Калмыкіі. Беларусь адкрыла аддзяленьні свайго пасольства ў 9 местах Расіі — Цюмені, Калінінградзе, Краснадары, Мурманску, Санкт-Пецярбургу, Уфе, Екацярынбургу, Новасібірску і Хабараўску. Гаспадарчыя сувязі зь Беларусяй маюць больш за 80 з 89 суб'ектаў РФ[2].

## Этапы расійскай рэгіянальнай палітыкі Лукашэнкі

Хаця Супольнасьць Беларусі й Расіі была абвешчана ў 1996 г., заўважная





| | Абарачэньне | Экспарт | Імпарт | Сальда |
|---|---|---|---|---|
| **г. Масква** (тыс. даляраў ЗША) | 226261 | 115419 | 110842 | 4577 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 36,48 | 44,52 | 30,71 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 1 | 1 | 2 | |
| **Цюменская вобласьць** (тыс. даляраў ЗША) | 143792 | 1372 | 142420 | -141048 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 23,19 | 0,53 | 39,46 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 2 | 31 | 1 | |
| **г. Санкт-Пецярбург** (тыс. даляраў ЗША) | 34633 | 21036 | 13597 | 7439 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 5,58 | 8,11 | 3,77 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 3 | 2 | 3 | |
| **Маскоўская вобласьць** (тыс. даляраў ЗША) | 27755 | 19071 | 8684 | 10387 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 4,48 | 7,36 | 2,41 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 4 | 3 | 5 | |
| **Смаленская вобласьць** (тыс. даляраў ЗША) | 19103 | 9633 | 9470 | 163 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 3,08 | 3,72 | 2,62 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 5 | 4 | 4 | |
| **Яраслаўская вобласьць** (тыс. даляраў ЗША) | 12361 | 5444 | 6917 | -1473 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 1,99 | 2,10 | 1,92 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 6 | 5 | 6 | |
| **Ніжагародзкая вобласьць** (тыс. даляраў ЗША) | 10590 | 5369 | 5221 | 148 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 1,71 | 2,07 | 1,45 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 7 | 6 | 7 | |
| **Бранская вобласьць** (тыс. даляраў ЗША) | 9739 | 5034 | 4705 | 329 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 1,57 | 1,94 | 1,30 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 8 | 8 | 8 | |
| **Сьвярдлоўская вобласьць** (тыс. даляраў ЗША) | | 8967 | 5080 | 3887 |
| 1193 | | | | |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 1,45 | 1,96 | 1,08 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 9 | 7 | 9 | |
| **Рэспубліка Татарстан** (тыс. даляраў ЗША) | 5969 | 3231 | 2738 | 493 |
| удзельная вага ў агульным аб'ёме, % | 0,96 | 1,25 | 0,76 | |
| месца ў агульным аб'ёме | 10 | 12 | 13 | |

Табліца 1. Тавараабарачэньне Рэспублікі Беларусі з абласьцямі Расійскай Фэдэрацыі за студзень 2002 году

актывізацыя беларускага кіраўніцтва ў справе наладжваньня кантактаў з расійскімі рэгіёнамі адбылася ў 1997 г. Пасьля канстытуцыйнага крызысу лістапада 1996 г. беларускае кіраўніцтва мела патрэбу ў дадатковых эканамічных гарантыях свайго кіраваньня. Пры адсутнасьці эканамічных рэформаў Беларусь не была прывабнай краінай для заходніх інвэстараў. Калі ж міжнародная супольнасьць не прызнала вынікаў рэфэрэндуму 1996 г., Беларусь магла апынуцца ў эканамічным крызысе. Пераадолець надыходзячы крызыс можна было пры дапамозе адзінай краіны, што прызнала вынікі рэфэрэндуму 1996 г., — Расіі. Як зацікаўлены бок, беларускае кіраўніцтва ўзяло ініцыятыву ў свае рукі і распачало праграму візытаў у расійскія рэгіёны.

Асабліва пасьпяховым быў візыт А. Лукашэнкі ў Краснадарскі край, які

адбыўся ў чэрвені 1997 г. Пасьля яго беларускі прэзыдэнт пачаў атрымоўваць шматлікія запрашэньні з абласьцей і краёў Расіі. Яго выказваньні пра незадаволенасьць рэалізацыяй шматлікіх пагадненьняў з расійскімі фэдэральнымі структурамі й намеры працаваць наўпрост з рэгіёнамі былі ўспрынятыя расійскімі рэгіянальнымі лідэрамі з энтузіязмам. А. Лукашэнка падпісаў з краснадарскім губэрнатарам Мікалаем Кандраценкам пакет пагадненьняў аб эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, узаемных пастаўках тавараў, які стаў узорам для пагадненьняў з кіраўнікамі іншых рэгіёнаў.

У верасьні 1997 г. А. Лукашэнка наведаў Маскву, у лютым 1998 г. — Прыморскі край і Новасібірскую вобласьць, у сакавіку 1998 г. — Мурманскую вобласьць, у траўні 1998 г. — Яраслаўскую вобласьць, у кастрычніку 1998 г. — Омскую і Кемераўскую вобласьці, у студзені 1999 г. — Смаленскую вобласьць. Беларусь за перыяд з 1997 па 1999 гг. наведалі дэлегацыі з Арла, Арэнбургу, Башкірыі, Валгаграду, Волагды, Калінінграду, Кастрамы, Рэспублікі Комі, Кургану, Ліпецку, Мардовіі, Мурманску, Новасібірску, Пскова, Разані, Смаленску, Татарстану, Томску, Удмуртыі, Уладзіміру, Якуціі, Яраслаўлю, Алтайскага, Краснадарскага, Стаўрапольскага, Прыморскага краёў, Чукоцкай аўтаномнай акругі, Масквы. Шмат якія з навязаных за гэты час кантактаў перарасьлі ў саюзныя праграмы. Не выпадкова першы бюджэт Саюзу Беларусі й Расіі на 1998 г. быў вызначаны зыходзячы з інтарэсаў рэгіёнаў: дызэльнае аўтамабілебудаваньне, лазэрныя тэхналёгіі, оптыка, вытворчасьць і перапрацоўка лёну, бульбы ды інш. Неўзабаве, калі гэтае пытаньне было абмеркаванае на паседжаньні Выканаўчага камітэту Саюзу Беларусі й Расіі, расійскія ўлады далі згоду на адкрыцьцё прадстаўніцтваў Беларусі ў Калінінградзе, Санкт-Пецярбургу, Мурманску, Краснадары, Цюмені.

У 1997 г. паміж урадам Беларусі й расійскімі рэгіёнамі было падпісана восем пагадненьняў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве. Гандлёвыя адносіны былі ўстаноўленыя практычна з усімі суб’ектамі Расійскай Фэдэрацыі, усяго было падпісана 90 пагадненьняў з расійскімі рэгіёнамі. Трыццаць расійскіх тэрыторыяў павялічылі ў параўнаньні з 1996 г. гандлёвае абарачэньне зь Беларусяй удвая, а Масква — у 2,5 разу.

Шмат якія зь візытаў беларускага прэзыдэнта ў расійскія рэгіёны суправаджаліся ня толькі падпісаньнем інтэграцыйных дамоваў, але таксама нефармальнымі сустрэчамі з расійскімі грамадзянамі, асобнымі працоўнымі калектывамі й г.д. Дзеля гэтага зь цягам часу расійскія палітычныя экспэрты пачалі закідаць Лукашэнку, што той распачаў выбарчую кампанію, а сам беларускі прэзыдэнт пачаў разглядацца як гулец на расійскай палітычнай сцэне. Сьпярша рэакцыя Крамля не была занадта жорсткай, бо стаўленьне да А. Лукашэнкі зьмякчалася расійскімі лабістамі, якія мелі інтарэсы ў Беларусі. Аднак неўзабаве адбыўся выбух — скандал з затрыманьнем журналіста ОРТ Паўла Шарамета, і ў жніўні 1997 г. губэрнатар Калінінградзкай вобласьці Леанід Гарбенка папрасіў Лукашэнку перанесьці свой заплянаваны візыт у гэты расійскі анкляў. У кастрычніку





таго ж году з-за адмовы расійскага боку прыняць самалёт беларускага прэзыдэнта былі сарваны ягоны візыт у Ліпецк і Яраслаўль, гэтым разам таму, што падчас заплянаванага Лукашэнкавага візыту ў Ніжнім Ноўгарадзе меўся знаходзіцца Б. Ельцын. Кіраўнікі Яраслаўскай і Ліпецкай абласьцей, не жадаючы псаваць адносінаў з прэзыдэнтам Расіі, адклікалі свае запрашэньні, выказаўшы шкадаваньне з нагоды палітычных перашкодаў расійска-беларускаму эканамічнаму супрацоўніцтву. “Самалётны крызыс” прайшоў для А. Лукашэнкі без істотных наступстваў. Больш за тое, кіраўнік адміністрацыі прэзыдэнта Ельцына Валянцін Юмашаў выказаў А. Лукашэнку ўдзячнасьць Б. Ельцына за яго вяжы ў Омск і Кемерава. Ім было заяўлена, што расійскае кіраўніцтва вітае ініцыятывы й практычныя крокі беларускага прэзыдэнта, скіраваныя на пашырэньне рэгіянальнага супрацоўніцтва і ўмацаваньне Саюзу Беларусі й Расіі агулам[3].

Узнаўленьне гаспадарчых сувязяў з расійскімі рэгіёнамі давала дзіўныя з гледзішча права формы інтэграцыі. Так, у ліпені 1999 г. у асацыяцыю “Цэнтральная Расія”, што ўключала 12 абласьцей і Маскву, увайшлі яшчэ чатыры беларускія вобласьці — Менская, Гомельская, Віцебская й Магілёўская. Нейкі час А. Лукашэнка выказваўся за ўвядзеньне “супольнай” валюты для ўзаемаразьлікаў паміж Астраханскай, Валгаградзкай, Растоўскай абласьцямі, Стаўрапольскім, Краснадарскім краямі й Беларусяй[4].

Заахвочваньне простых кантактаў паміж беларускімі й расійскімі прадпрыемствамі павысіла тавараабарачэньне паміж дзьвюма краінамі больш чым на трацiну, прычым каля 50% яго прыпадала на Маскву, Санкт-Пецярбург, Татарстан, Цюменскую, Курскую, Маскоўскую, Кемераўскую, Валгаградзкую й Сьвярдлоўскую вобласьці. На 1998 г. Беларусь мела дзелавыя сувязі больш чым з 55 рэгіёнамі Расіі. Пры гэтым 65% росту ўзаемнага гандлю было атрымана за кошт рэгіянальнага партнэрства[5].

## Палітычныя аспэкты беларуска-расійскіх міжрэгіянальных адносінаў

А. Лукашэнка выкарыстоўваў саюзныя структуры для павелічэньня свайго палітычнага ўплыву ў Расіі, які, на яго думку, толькі і мог стварыць глебу для разьвіцьця эканамічных адносінаў з Расіяй. Масква, натуральна, не вітала прыходу беларускага прэзыдэнта ў расійскую палітыку і ціснула на яго пры дапамозе эканамічных вагароў. У такіх умовах поле Лукашэнкавай дзейнасьці на расійскай палітычнай сцэне было абмежаванае выступамі перад насельніцтвам падчас вяжоў па расійскіх рэгіёнах і запрашэньнем да сябе ў госьці расійскіх губэрнатараў.

Сустрэчы з працоўнымі калектывамі расійскай правінцыі ўздымалі папулярнасьць А. Лукашэнкі сярод часткі расійскага грамадзтва, незадаволенай посткамуністычным развоем Расіі. Асабліва гэтаму спрыяла Лукашэнкава крытыка палітыкі Крэмля, на якую ён не скупіўся падчас сустрэчаў з расійскімі масамі. Асабліва моцна Лукашэнка ганьбіў курс на лібэралізацыю эканомікі. Рэфарміс-

цка арыентаваных палітыкаў фэдэральнага ўзроўню такія падарожжы насьцярожвалі, пагатоў у 1997—1999 гг. у Расіі й без таго назначыўся крызыс улады. Праціўнікі А. Лукашэнкі выказвалі нават меркаваньне, што мэта вандровак беларускага лідэра ў расійскую правінцыю — згуртаваць вакол сябе расійскую эліту ў абход Крамля, стварыўшы трохкутнік "А. Лукашэнка — Я. Строеў — губэрнатары"[6]. А. Лукашэнка і сам нярэдка лісьлівіў расійскім рэгіянальным лідэрам, кажучы, што гэта яны, а не Масква, рэальна кіруюць Расіяй і напаўняюць рэальным зьместам саюз зь Беларусяй. 28—29 ліпеня 1998 г. беларускі прэзыдэнт заплянаваў склікаць своеасаблівы форум расійскіх і ўкранскіх губэрнатараў з тым, каб, паводле ягоных словаў, пазнаёміць іх зь Беларусяй. На сустрэчу былі запрошаныя 40 кіраўнікоў рэгіёнаў, але прыехалі ўсяго пяць першых асобаў — губэрнатары Краснадарскага краю, Яраслаўскай, Уладзімірскай, Пскоўскай абласьцей і старшыня Дзяржаўнай Рады Удмурціі. Астатнія абмежаваліся накіраваньнем сваіх прадстаўнікоў, а ўкраінскія губэрнатары ўвогуле праігнаравалі імпрэзу[7]. У верасьні 1998 г. адбылася яшчэ адна сымбалічная сустрэча А. Лукашэнкі з групай расійскіх губэрнатараў. На гэты раз адгукнулася большая колькасьць запрошаных, у тым ліку былі старыя сымпатыкі А. Лукашэнкі краснадарскі губэрнатар Мікалай Кандраценка, кіраўнік Тульскай вобласьці Васіль Старадубцаў, кіраўнікі Стаўрапольскай, Уладзімірскай і Бранскай абласьцей Аляксандар Чарнагораў, Мікалай Вінаградаў, Юры Лодкін. Сярод гасьцей былі таксама кіраўнікі Ліпецкай і Смаленскай абласьцей Алег Каралёў і Аляксандар Прохараў, якія тады сымпатызавалі левым, пскоўскі губэрнатар, у тую пару яшчэ чалец ЛДПР, Яўген Міхайлаў і нават ляяльныя Ельцыну яраслаўскі й цьвярскі губэрнатары Анатоль Лісіцын, Уладзімер Платаў, старшыня Дзяржаўнай Рады Удмуртыі Аляксандар Волкаў і губэрнатар Таймырскай аўтаномнай акругі Генадзь Нядзелін. Якія-колечы важныя эканамічныя пастановы на гэтай сустрэчы прынятыя не былі, але сам факт яе правядзеньня ў Віскулёх мусіў прадэманстраваць ініцыятыву беларускага прэзыдэнта ў рэінтэграцыі постсавецкай прасторы пры паразуменьні з кіраўнікамі расійскіх рэгіёнаў.

Разам з тым ня ўсе рэгіянальныя лідэры Расіі з энтузіязмам паставіліся да такіх захадаў А. Лукашэнкі. Апазыцыю беларуска-расійскай інтэграцыі ў Лукашэнкавай рэдакцыі ўзначалілі ўплывовыя лідэры нацыянальных рэспублік Расіі. Увесну 1997 г., калі рыхтавалася дамова аб Саюзе, супраць аб'яднаньня адкрыта выступіў прэзыдэнт Татарстана Мінтымер Шайміеў, які заявіў, што яднаньне зь Беларусяй азначыцца для Расіі ўскладненьнем палітычнай сытуацыі ў Эўропе і ня будзе ўзважаным рашэньнем[8]. Яшчэ разчэйшыя заявы лідэраў нацыянальных рэспублік выклікала падпісаньне Дэклярацыі аб далейшым яднаньні Беларусі й Расіі ад 25 сьнежня 1998 г., якая прадугледжвала вынясеньне дамовы аб стварэньні адзінай дзяржавы на ўсенароднае абмеркаваньне за паўгоду. Прэзыдэнт Інгушэтыі Руслан Аўшаў адзначыў, што саюз Беларусі й Расіі можна вітаць, калі пад ім разумеецца эканамічная інтэграцыя з пэўнымі палітычнымі ўзаемнымі абавязаньнямі, як у краінах Эўразьвязу. Калі ж гаворка йдзе пра новае дзяржаўнае ўтварэньне, то многія нацыянальныя рэспублікі РФ могуць паставіць пытаньне пра павышэньне свайго статусу. М. Шайміеў і прэзыдэнт Башкірыі Муртаза Рахімаў таксама выступілі супраць стварэньня супольнай дзяржавы зь Беларусяй. На іх думку, калі такое адбудзецца, то гэта зьменіць структуру суб'ектаў усёй фэдэрацыі й яны запатрабуюць пашырэньня правоў сваіх рэспублік[9]. Сярод уласна "расійскіх" рэгіянальных лідэраў, якія збольшага віталі інтэграцыю, вынятак склаў Эдурад Росэль. Пачынаючы з 1997 г. ён выказваў меркаваньне, што расійска-беларускія інтэграцыйныя пагадненьні могуць спрыяць дэзінтэграцыі Расіі.





Тое, што актыўнасьць беларускага прэзыдэнта ў расійскіх рэгіёнах несла ў сабе небясьпеку няўстойліваму расійскаму фэдэралізму, пацьвярджалі словы адказнага сакратара Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расіі Ўладзімера Аксёнава: "…ува ўмовах дэградацыі расійскай дзяржаўнасьці, распаду фэдэральнага "гравітацыйнага поля" Менск аб'ектыўна стаецца новым прыцягальным цэнтрам для значнай часткі рэгіёнаў Расіі, асабліва для расійскіх краёў і абласьцей. Крызыс расійскай дзяржавы прывёў да таго, што "беларуская карта" ізноў робіцца казырнай ува ўнутрыпалітычнай барацьбе за ўладу ў Расіі"[10]. У 1997 г., напярэдадні падпісаньня саюзнай дамовы зь Беларусяй, блізкія да Анатоля Чубайса дараднікі Б. Ельцына зьвярнулі ўвагу расійскага прэзыдэнта на тое, што, падпісаўшы дамову, ён можа згубіць кантроль над Найвышэйшай Радай Саюзу і тым самым пусьціць А. Лукашэнку ў расійскую палітыку. У выніку ў апошні момант расійскі бок скарэгаваў дамову у пляне выдаленьня зь яе новаўвядзеньняў у параўнаньні з дамовай пра стварэньне Супольнасьці, падпісанай у 1996 г.[11].

Выклік, які беларускі прэзыдэнт кідаў Маскве як фэдэральнаму цэнтру, у некаторым сэнсе быў вымушаны. Ува ўмовах працяглага палітычнага крызысу ў Расіі, калі прынцыпова важныя рашэньні немагчыма было прыняць на фэдэральным узроўні, беларускае кіраўніцтва прытрымлівалася рэгіянальнай мадэлі разьвіцьця інтэграцыі як найбольш эфэктыўнай. Гэта ня толькі лісьлівіла расійскім "рэгіяналам", але й ня шкодзіла Крамлю. Кіраўнікам суб'ектаў фэдэрацыі актыўнасьць А. Лукашэнкі ў непрэзыдэнцкай справе наладжваньня простых сувязяў з рэгіёнамі несла разьвязаньне эканамічных праблемаў. Крэмль, у сваю чаргу, ня моцна пярэчыў актыўнасьці А. Лукашэнкі ў рэгіёнах, бо, пашыраючы міжрэгіянальныя гаспадарчыя сувязі, Беларусь сама пераўтваралася — прынамсі, на словах беларускага прэзыдэнта — у дзевяносты суб'ект Расійскай Фэдэрацыі. Калі ўлічыць, што амаль тры чвэрці насельніцтва Расіі падтрымоўвала ў 1999 г. стварэньне Саюзнай дзяржавы[12], актыўнасьць А. Лукашэнкі ў расійскіх рэгіёнах, з аднаго боку, падтрымоўвала прадпрыемствы расійскай правінцыі, а з другога — паляпшала стаўленьне часткі камуністычнага электарату да палітыкі Крамля.

У красавіку 1999 г. А. Лукашэнка прапанаваў Б. Ельцыну радыкальны варыянт аб'яднаньня з увядзеньнем пасады адзінага прэзыдэнта, стварэньнем адзінага ўраду, парлямэнту, бюджэту й войска. Масква настаяла на мякчэйшым вары-

янце зьліжэньня. Падпісаная ў выніку дамова неістотна адрозьнівалася ад дамовы 1997 г. Найбольш істотнай ейнай навацыяй сталі простыя выбары ніжняй гасподы парлямэнту Саюзнай дзяржавы ды больш дэталёвая рэглямэнтацыя бюджэтнага працэсу. Адначасова была прынятая інтэграцыйная праграма, у якой на тэрмін да 2005 г. былі прапісаныя мэханізмы й формы стварэньня адзінай эканамічнай прасторы. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2000 г. у меру пераадоленьня крызысу ўлады ў Расіі інтэграцыйныя заклікі А. Лукашэнкі пачалі страчваць тую актуальнасьць, што мелі пры Б. Ельцыну. Здабыткі беларускага прэзыдэнта ў расійскіх рэгіёнах так і не былі выкарыстаныя ім для ўдзелу ў расійскай палітыцы. На сёньняшні дзень за імі захавалася выключна эканамічнае значэньне.

## Вытворчая каапэрацыя паміж беларускімі й расійскімі прадпрыемствамі

Гаспадарчыя й гандлёвыя сувязі прадпрыемстваў абедзьвюх краінаў, якія наладжваліся намаганьнямі беларускага кіраўніцтва й лідэраў расійскіх рэгіёнаў, іграюць ключавую ролю ў беларуска-расійскай інтэграцыі. Паколькі аб’ём гаспадарчых сувязяў і ўзаемнага гандлю паміж самімі суб’ектамі РФ нярэдка саступае аналягічным паказьнікам зь Беларусяй, то Беларусь часам сапраўды выступае інтэгратарам расійскіх рэгіёнаў. Гаспадарчыя дамовы, асабліва на золку інтэграцыі, укладаліся пераважна на ўрадавым ўзроўні.

У сакавіку 1997 г. была дасягнута ўрадавая дамоўленасьць аб пастаўцы рухавікоў Менскага маторнага заводу для малалітражнага аўтамабіля ЗІЛ-5301. У жніўні адбыўся візыт У. Ярмошына ў Яраслаўль, дзе было дасягнутае пагадненьне паміж кіраўніцтвам МАЗу й Яраслаўскага маторнага заводу аб камплектацыі беларускіх цяжарнікоў расійскімі маторамі. У тым жа месяцы, падчас візыту беларускай дэлегацыі ў Маскву, было пастаноўлена стварыць міжрэгіянальную кансультацыйную навукова-тэхнічную раду з спэцыялістаў Менску й Масквы для больш эфэктыўнага ўкараненьня ў вытворчасьць распрацовак расійскіх і беларускіх навукоўцаў. Падчас візыту Ю. Лужкова ў Менск 27 лістапада 1998 г. адпаведнае пагадненьне было падпісанае[13]. У сьнежні 1998 г. падчас візыту дэлегацыі адміністрацыі Ўладзімірскай вобласьці ў Беларусь быў падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве зь Міністэрствам прамысловасьці Беларусі, у якім была прадугледжаная арганізацыя зборкі трактароў “Беларусь” на ААТ “Уладзімірскі трактарны завод”[14].

За 1996—1998 гг. прадстаўнікі расійскіх рэгіёнаў падпісалі 115 пагадненьняў і дамоваў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве з адміністрацыямі абласьцей Беларусі й каля 40 — зь беларускімі міністэрствамі й ведамствамі. Да лістападу 1999 г. сумесныя эканамічныя праекты зь Беларусяй мелі 70 суб’ектаў РФ. Аднак высокая інтэнсіўнасьць наладжваньня эканамічных сувязяў паміж Беларусяй і рэгіёнамі Расіі ня стала





сьведчаньнем іх эфэктыўнасьці. Больш за тое, эканамічная выгада і мэтазгоднасьць не былі галоўным крытэрам, якім кіраваўся беларускі ўрад у выбары партнэраў для беларускіх прадпрыемстваў. Навязваньне эканамічных кантактаў зьдзяйсьнялася ім толькі па дасягненьні ўзаемаразуменьня ў палітычных пытаньнях. Паколькі прынцыпам устанаўленьня й разьвіцьця кантактаў Беларусі з тым ці іншым суб’ектам Расійскай Фэдэрацыі было падабенства сацыяльна-палітычных поглядаў іх кіраўніцтва, то наладжваньне эканамічных сувязяў насіла даволі бессыстэмны характар. Гэта значна зьніжала эканамічную эфэктыўнасьць беларуска-расійскай інтэграцыі. Эканамічныя выгады ад такога супрацоўніцтва таксама зьніжаюць неплацежаздольнасьць гаспадарчых суб’ектаў абедзьвюх краінаў, адсутнасьць эфэктыўнага разьлікова-плацежнага мэханізму, благая маркетынгавая палітыка вытворцаў.

Шмат якія з сумесных праектаў сутыкаліся з паважнымі цяжкасьцямі пры выкананьні. У чэрвені 1998 г. “ЗІЛ” спыніў пастаўкі прадукцыі ў лік бартэрнага разьліку па кантракце з ВА “Менскі трактарны завод”[15]. Праблемы з напаўненьнем саюзнага бюджэту, зь якога фінансавалася дзейнасьць ФПГ “БелРасАўта”, прывялі ўлетку 1998 г. да спыненьня канвэеру на МАЗе[16]. З-за нявыплаты заробкаў увосень 1998 г. застрайкаваў Яраслаўскі маторны завод, дзе выратаваць становішча ўдалося толькі дзякуючы асабістаму ўмяшальніцтву А. Лукашэнкі, які “прабіў” для ЯМЗ дзяржаўны крэдыт[17]. Праблемы стварала й няўзгодненая маркетынгавая палітыка беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў. Улетку 1998 г. у Смаленску з-за імпарту піва менскага бровару “Крыніца” тамтэйшы бровар быў загружаны ўсяго на 30% вытворчых магутнасьцяў[18]. Губэрнатар Курганскай вобласьці Алег Багамолаў выказваў незадаволенасьць тым, што Менскі завод колавых цягачоў адбірае рынкі збыту курганскаму заводу, бо вырабляе й пастаўляе на поўнач Расіі машыны той жа самай клясы[19].

Асобным кірункам эканамічнай каапэрацыі стала стварэньне беларуска-расійскіх фінансава-прамысловых групаў. У 2000 г. беларускія юрыдычныя асобы ўваходзілі ў 10 з 87 расійскіх фінансава-прамысловых групаў. Палова зь іх (“Міждзяржмэтыз” (“Межгосметиз”), “БелРасАўта”(“БелРусАвто”), “Фармаш” (“Формаш”), “Электронныя тэхналёгіі” (“Электронные технологии”), “Інтэраграінвэст” (“Интерагроинвест”)) стваралася на базе міжурадавых пагадненьняў і атрымала статус дзяржаўных. Засталыя групы (“Дакладнасьць” (“Точность”), “Ніжагародзкія аўтамабілі” (“Нижегородские автомобили”), “Славянская папера” (“Славянская бумага”), “Аэрафін” (“Аэрофин”) і “Аптроніка” (“Оптроника”)) былі зарэгістраваныя як транснацыянальныя. У форме фінансава-прамысловых групаў разьвіваюцца сувязі паміж дзяржаўнымі сэктарамі нацыянальных эканомік, у якіх сканцэнтраваны буйны капітал.

## Высновы

Беларуска-расійская інтэграцыя найдалей зайшла ў навязваньні гаспадарчых сувязяў на рэгіянальным узроўні. Аднак паколькі Беларусь як ініцыятар іх разьвіцьця не арыентаваная на рынкавыя рэформы, а беларускае кіраўніцтва пры наладжваньні партнэрскіх сувязяў для сваіх прадпрыемстваў шукала партнэраў у першую чаргу сярод аднадумцаў, то вынікам такой інтэграцыі стала стварэньне своеасаблівых запаведнікаў адміністрацыйна-каманднай сыстэмы гаспадараньня. Пад эгідай беларуска-расійскай інтэграцыі беларускі рэжым спрыяў рэанімацыі датацыйных прадпрыемстваў, якія цяпер фінансуюцца за кошт бюджэту Саюзнай дзяржавы. Гэта, у сваю чаргу, робіць іх закладнікамі напаўненьня саюзнага бюджэту.

Разьвіцьцё гандлёва-эканамічных адносінаў Менску з расійскімі рэгіёнамі будзе і надалей вызначаць будучыню беларуска-расійскай інтэграцыі. Між тым, зьбліжэньне праўных нормаў дзьвюх краінаў, што рэгулююць гаспадарчыя сувязі, яшчэ не пачалося, таму тэндэнцыі далейшай трансфармацыі сыстэмы супрацоўніцтва, што склалася ў Беларусі з рэгіёнамі Расіі, ня вызначаныя.

[1] О внешней торговле Республики Беларусь с Российской Федерацией в январе 2002 года. <http://www.embassybel.ru>

[2] Гордейчик В.К. Внешнеторговые связи Беларуси с важнейшими регионами России // Белорусская экономика: анализ, прогноз, регулирование. — 2001. — № 6. — С. 32.

[3] Независимая газета. — 1998. — 31 октября.

[4] Независимая газета. — 1999. — 28 мая.

[5] Выступление Президента А.Г. Лукашенко в Морской академии во Владивостоке 23 февраля 1998 года // Советская Белоруссия. № 52, 24.02.1998.

[6] Новые Известия. — 1998. — 2 апреля.

[7] Калиновская Т. “Съезд губернаторов” не получился // Белорусский рынок. — 03.08.1998, № 30.

[8] Независимая газета. — 1997. — 19 апреля.

[9] Сегодня. — 29.12.1998; Век. — 30.12.1998; Независимая газета. — 30.12.1998.

[10] Независимая газета. — 31.10. 1998.

[11] Селиванова И.Ф. Россия — Беларусь: от союза к Союзному государству (о некоторых факторах российско-белорусского объединения) // Белорусско-российские отношения: проблемы и перспективы: Мат-лы Второго “круглого стола” белорусских и российских ученых. — Минск, 26—27 января 1999 г. — Минск, 2000. — С. 35-43.

[12] Прибытковский Ф. Единение России и Беларуси: проблемы и перспективы (информация о 3-м “круглом столе” ученых России и Беларуси) // Белорусский журнал международного права и международных отношений. — 2000. — № 1.

[13] Белорусская газета. — 30.11.98

[14] Рэспубліка. — 12.12.98.

[15] Сехович В. Реализация контракта АМО “ЗИЛ” и Минского моторного завода снова под вопросом // Белорусская деловая газета. — 1998. — № 5, 17 августа.





[16] Белорусский рынок. — 20—26.06.98

[17] Общая газета. — 1998. — 29 октября — 4 ноября.

[18] Смыслова А. Белорусские пивзаводы подрывают работу смоленских // Белорусская деловая газета. — 1998. — № 6, 20 августа.

[19] Гриб Н. Белорусская помощь в продаже российского вооружения // Белорусская газета. — 1998. — № 154, 5 октября.